якой дазваляе фарміраваць і развіваць навыкі сумеснага музіцыравання, можна вывучаць хаця б у III і IУ семестрах, але ні ў якім выпадку не пакідаць на УП і УIII семестры, як гэта прадугледжана ў плане (студэнты ж з 1 семестра ўжо займаюцца ў харавым класе!). Трэба было б падумаць і аб вывучэнні хаця б на другім курсе, як гэта мае месца ў аркестрантаў, дысцыплін "Расшыфроўка беларускіх народных песень" і "Аранжыроўка беларускіх народных песень", якія па плану ідуць толькі ў У1 семестры.

У1. Разгляд праблемы двухузроўневага навучання дазволіў нам прыйсці да наступных прапаноў аб пераемнасці ў навучанні бакалаўраў і магістраў.

1. Каб кардынальным чынам не ламаць навучальныя планы, якія сфарміраваліся, адысці ад аднаўзроўневай вышэйшай адукацыі, падрыхтоўку спецыялістаў з дыпломам бакалаўра можна ажыццяўляць на працягу васьмі семестраў. Галоўная задача ў навучанні студэнтаў па спецыяльных дысцыплінах павінна звесціся да развіцця індывідуальна-выканальніцкіх прафесійных якасцей, навыкаў ансамблевага музіцыравання, аркестравага (харавога) выканання - аркестравыя (харавыя) партыі, сольныя фрагменты твораў або сола ў суправаджэнні калектыву. У прынцыпе гэтыя ж пытанні, але на парадак ніжэй і ў меншай ступені цяжкасці вырашаюцца ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Таму, на наш погляд, быў бы рэзон выпускнікам гэтых устаноў па аналагу з замежным вопытам прысвойваць прафесійную ступень бакалаўра, а ў нашай навучальнай установе - ніжэйшую навуковую ступень бакалаўра. Для гэтага па аднаму з курсаў блока музычна-тэарэтычных і спецыяльных дысцыплін выпускнік павінен напісаць і публічна абараніць адпаведную дыпломную работу.

2. На пятым годзе навучання ў ВНУ бакалаўры рыхтаваліся б да абароны дыплома на наступную вучоную ступень, ступень магістра. Галоўнай задачай навукова-даследчай і творча-выканальніцкай падрыхтоўкі такіх спецыялістаў было б фарміраванне мастацка-аналітычнага мыслення. Іх навучанне можа ажыццяўляцца па аналагу асістэнтуры-стажыроўкі: блок агульна-навуковых дысцыплін; блок спецдысцыплін; спецкурсы; падрыхтоўка дыпломнай работы (нават пры творчым паказе неабходна напісаць і абараніць дыплом, як гэта практыкавалася на факультэце ваенных дырыжораў Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі).

Бураўкін А.Г.,
канд.тэхн.навук, дацэнт
Зязюля А.Р.,
ст.выкладчык
Каленька Р.Р.,
канд.мастацтвазнаўства,дацэнт
Кульша В.М., ст.выкладчык
Шылкіна А.М., выкладчык
Шчасная Л.С., выкладчык

## ЭЛЕМЕНТЫ КАНСТРУЯВАННЯ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ НА АСНОВЕ КАМП'ЮТЭРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Узаемадзеянне мастацтва з дакладнымі ведамі прывяло да ўзнікнення новых тэхналагічных сродкаў увасаблення мастацкіх твораў (камп'ютэрная музыка, камп'ютэрная графіка).

Ужыванне сістэмных і камп'ютэрных сродкаў падтрымкі мастацкай творчасці спрыяе свядомаму засваенню ведаў аб мастацтве. Сістэмныя і камп'ютэрныя мадэлі мастацкіх твораў адлюстроўваюць гэтыя веды ў выглядзе канструкцыі з дакладнай многаўзроўневай структурай. Гэта дазваляе не толькі ўсвядоміць унутраную структуру твора (канструкцыі), але і ствараць (канструяваць) новыя творы ў межах і на аснове агульнай тэхналогіі з улікам узаемадзеяння новай канструкцыі з навакольным светам.

Распрацоўка элементаў сістэм канструявання мастацкіх твораў вядзецца зараз па напрамках:

- мадэліраванне кампанавання плоскіх каляровых геаметрычных вобразаў;
- мадэліраванне геаметрычнага малюнка танца;
- канструяванне музычных тэкстаў.

Ровіна Р.А.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## БЕСПЕРАПЫННАЯ ПАДРЫХТОЎКА БІБЛІЯТЭКАРАЎ ВА ЎМОВАХ УНІВЕРСІТЭТА

1. Неабходнасць удасканалення бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі, якая перажывае сур'ёзныя цяжкасці, звязаныя з сацыяльна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ